Платонова, но при этом предвидел и трудности, связанные с его публикацией.

Только сегодня, возвращенная из многолетнего забвения, эта книга стала для многих читателей открытием нового имени в литературе.

[1] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 22. С. 117.

[2] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 16. Ч. 2. С. 52.

[3] Манюэл Ф. Ю. Утопическая мысль в западном мире. М., 1983. Вып. 2. С. 5.

[4] Кузнецов М. Социалистический реализм и модернизм // Новый мир. 1963. № 8. С. 221.

[5] Платонов А. Чевенгур. Мн., 1989. С. 191.

[6] Там же. С. 274.

[7] Капустин М. П. От какого наследства мы отказываемся? // Октябрь. 1988. № 4. С. 189.

І. Р. СЦЯПУНІН

## ПУШКІН І НАРОД

Мільённыя тыражы пушкінскіх кніг, экранізацыя пушкінскай прозы, усенароднае паломніцтва ў пушкінскія мясціны, імя паэта — у назвах музеяў, бібліятэк, тэатраў... Інтарэс народа да творчасці Пушкіна, павага да яго памяці ў нас у краіне традыцыйныя. Пра гэта сведчаць і цікавыя матэрыялы Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР за 1899 г., калі ў народзе адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння вялікага рускага паэта.

Царскія ўлады не былі зацікаўлены ў тым, каб пушкінскі юбілей быў усенародным урачыстасцю. У наваколлі Святых Гор (Пушкінагор'я) і сяла Міхайлаўскага конныя паліцэйскія не пускалі простых людзей прысутнічаць на пушкінскім свяце, «некаторыя асобы ніяк не маглі прымірыцца з перспектывай, што там, дзе гуляюць паны, туды паўзе і барада (селянін): «Усё для паноў! А нас нікуды не пускаюць,— чулася з усіх бакоў...» (прачытаем у адной карэспандэнцыі). Прыводзіліся і іншыя факты. У Сімферопалі, напрыклад, у час пастаноўкі пушкінскай п'есы гарадскі галава палічыў жонку афіцэра за простую жанчыну і «прапанаваў ёй пакінуць залу, маўляў, яна нічога агульнага з Пушкіным не мае»[1].

Але нягледзячы на забароны і ўсялякія абмежаванні з боку ўлад, менавіта просты народ быў сапраўдным знаўцам Пушкіна. Так, сяляне Варанецкай воласці Апачэцкага павета Пскоўскай губерні пабудавалі ў 1895 г. на свае сродкі непадалёку ад магілы паэта двухпавярховы паўмураваны будынак багадзельні імя Пушкіна для састарэлых аднавяскоўцаў[2]. У многіх губернях сяляне аднагалосна рашалі ў памяць паэта адкрыць пры школах бібліятэкі і даваць ім назвы «пушкінскія».

У Віцебскай губерні ў юбілеі Пушкіна актыўны ўдзел прынялі беларускія сяляне. Святкаваў, як гаворыцца ў адной з карэспандэнцый, «увесь народ — ад малапісьменнага ці зусім непісьменнага да адукаванага, ад дзіцяці да старога». У Віцебску на працягу мая 1899 г. было прададзена 45 тыс. экз. твораў паэта[3]. Святкаванне стагоддзя з дня нараджэння вялікага паэта ў Мінску паказала, наколькі Пушкін быў блізкі і дарагі беларускаму народу. «Такой урачыстасці яшчэ не было ў нас. З самых глухіх гарадоў паступаюць звесткі пра ушанаванне паэта»,— піша «Минский листок»[4].

Пушкін трывала ўвайшоў у народную памяць. У «Витебские губернские ведомости» дасылаліся запісы вусных расказаў сялян, у якіх вялікі паэт паказаны як выключна добры чалавек, гатовы дапамагчы ўсім бедным людзям.

«Аднойчы быў неўраджай,— расказвае 75-гадовы селянін вёскі Гайкі (што ля Міхайлаўскага) Апанас Васільеў.— У беднага мужыка не было ні хлеба, ні грошаў, каб купіць што-небудзь. Пайду, гаворыць, папрашу ў Пушкіна, можа дасць хлеба. Падыходзіць да вёскі, а каля яе вялікі лес. І выходзіць з ельніка насустрач мужыку Пушкін, кашуля чырвоная, капялюш саламяны, у руцэ — кніжка». Мужык вырашыў, «што перад ім стаіць барскі халоп ці лакей, ды і расказаў яму пра сваю патрэбу. Пушкін быў узрадаваны, што мужык прыняў яго за простага чалавека, і даў яму хлеба».

Селянін Іван Паўлаў з вёскі Багамілы расказвае: «Жыў ён адзін, з панамі надта не сябраваў, на паляванне з імі не хадзіў, сялян любіў... і з усімі ласкава, па-добраму абыходзіўся. Дзеткі летам назбіраюць ягад, панясуць яму прадаваць, а ён грошы заплоціць і ягады ім аддае»[5].

У іншых расказах Пушкін прадстаўлены барацьбітом за інтарэсы сялян. Пра гэта піша віцебскі карэспандэнт Д. Ф. Шчалок, які наведаў Святагор'е ў дні пушкінскіх урачыстасцей і гутарыў з сялянамі. «У Пушкіна,— сказаў яму адзін сталы селянін,— было тры думы. Першая дума, каб нас ад паноў адабраць, другая дума — каб розгамі не высякаць. А трэцяя — каб усю зямлю мужыкам аддаць».

У некаторых вусных расказах, запісаных А. А. Карасёвым, гаворыцца пра інтарэс народа да твораў Пушкіна яшчэ пры жыцці вялікага паэта. А. Карасёў сведчыць: калі Пушкін наведваў у 1829 г. Навачэркаск, то пазнаў, што яго вершы вельмі папулярныя сярод усіх жыхароў горада. У народныя масы прыйшлі многія творы Пушкіна: яго казкі, вершы. Яны сталі папулярныя ў вуснай перадачы побач з фальклорнымі творамі. «Кожны шкаляр,— гаворыцца ў адной карэспандэнцыі,— ледзь не з першага года сваёй вучобы пачынае знаёміцца з лепшымі вершамі Пушкіна. Завучваючы іх услых, ён міжволі робіць слухачамі сваіх непісьменных бацькоў, прымушае іх таксама захапляцца, як і сам захапляецца».

Селянін Ніжагародскай губерні Ф. І. Дарафееў выказаў сапраўдныя адносіны народных мас да вялікага рускага паэта: «У сваіх вершах Пушкін выказаў не толькі свае пачуцці, а пачуцці ўсяго народа, за што просты чалавек глыбока паважае яго бессмяротнае імя»[6].

«Витебские губернские ведомости» адзначаюць, што ў 1899 г. пачынаюць ужо збывацца словы Пушкіна: «Слух обо мне пройдет по всей Руси великой, и назовет меня всяк сущий в ней язык». 15 сакавіка 1899 г. група малдаван-рамеснікаў у Кішынёве звярнулася да ўлад «з просьбай дапамагчы ім надрукаваць да ўрачыстых святкаванняў вялікага паэта паэму «Цыганы» з кароткім біяграфічным нарысам аб яе геніяльным аўтары для распаўсюджвання выдання па таннай цане сярод грамадзянскага насельніцтва Бесарабіі».

Але непісьменнасць большасці насельніцтва царскай Расіі стала непераадольнаю перашкодаю для знаёмства з творчасцю Пушкіна. Шмат якія творы вялікага паэта царскія ўлады забаранялі распаўсюджваць сярод народа. Так, паэма «Цыганы», на погляд цэнзуры, непрыдатная народу, таму што тут «выказваюцца думкі аднабаковыя. У ёй галоўны герой Алека гаворыць пра «неволю душных городов», дзе людзі «торгуют волею своей, главы пред идолами клонят и просят денег да цепей».

Забараняліся і іншыя пушкінскія творы. Так, паэма «Братья-разбойники» была прызнана «непажаданай для распаўсюджвання яе сярод народу», бо «змест яе можа засмуціць чытача, асабліва простага чалавека». У паэме ўслаўляецца вольналюбства. Не дазвалялася таксама дапускаць да чытачоў «Гісторыю Пугачова» таму, што ў ёй у вельмі непрывабным выглядзе апісваецца імператрыца Кацярына II, усе яе фаварыты і воінскія начальнікі[7].

Народу не рэкамендавалася таксама чытаць раман у вершах «Евгений Онегин» і многія іншыя творы. Царскія ўлады, безумоўна, не жадалі, каб уся творчасць Пушкіна стала здабыткам шырокіх народных мас. Але гісторыя паказала, што «Пушкін, які выявіў нацыянальны гонар і славу рускага народа, стаў нацыянальным гонарам і славаю кожнага беларуса, грузіна, украінца, літоўца, казаха»[8].

[1] ЦДГА БССР. Ф. 1416, воп. 6, адз. зах. 605, т. 1, арк. 74; ф. 1416, воп. 6, адз. зах. 609, арк. 27.

[2] Там жа. Ф. 321, воп. 1, адз. зах. 406, арк. 1.

[3] Там жа. Ф. 1416, воп. 6, адз. зах. 605, арк. 475, 270.

[4] Минский листок, 1899, 26 мая.

[5] ЦДГА БССР. Ф. 1416, воп. 6, адз. зах. 605, арк. 127.

[6] Там жа. Адз. зах. 611, арк. 183—183 об.; адз. зах. 630, арк. 518; адз. зах. 606, арк. 1492; адз. зах. 636, арк. 721; адз. зах. 606, т. 2, арк. 1492.

[7] Там жа. Адз. зах. 605, т. 2, арк. 745; адз. зах. 628, арк. 634.

[8] Колас Я. Зб. тв.: У 14 т. Мн., 1976. Т. 12. С. 84.